4. Дук, Д.У. Справаздача аб раскопках у горадзе Полацку, Верхнядвінскім і Расонскім раенах Віцебскай вобласці у 2004 годзе / Д.У. Дук // ААНД ИИ НАН Беларуси. Дело № 2167.
5. Дук, Д.У. Справаздача аб археалагічных даследваннях на абекце «Узвядзенне помніка героям вайны 1812 г. у г. Полацку» у 2009 годзе / Д.У. Дук // ААНД ИИ НАН Беларуси. Дело № 2647.
6. Кирпичников, А.Н. Древнерусское оружие. Вып. 2. Копья, сулицы, боевые топоры, булавы, кистени / А.Н. Кирпичников // САИ. – 1966. – Вып. EI-36. – 147 с.
7. Магалінскі, І.У. Прывескі-амулеты з тэрыторыі Полацка (X – XIII стст.) / І.У. Магалінскі // Віцебск. старажытнасці: матэрыялы навук. канф., прысвечанай 90-годдзю з дня нараджэння Л.В. Алексеева. Мінск, 2012. – С. 287 – 298.
8. Макаров, Н.А. Декоративные топорики из Белозерья / Н.А. Макаров // Памятники культуры: нов. открытия; Письменность. Искусство. Археология. – 1987. – М., 1988 – С. 455 – 460.
9. Макаров, Н.А. Древнерусские амулеты-топорики / Н.А. Макаров // Рос. археология. – 1992. – № 2. – С. 41 – 56.
10. Макаров, Н.А. Кемский некрополь в Северном Белозерье / Н.А. Макаров, А.С. Беляков // КСИА. – 1989. – Вып. 198. – С. 75 – 84.
11. Климов, М. В. Раскопки в Лучно, 2011 г. / М.В. Климов.
12. Рыбаков, Б.А., Язычество Древней Руси / А. Б. Рыбаков. – М.: Наука, 1987. – 783 с.
13. Седова, М.В. Ювелирные изделия Древнего Новгорода (10 – 15 вв.) / М.В. Седова. – М.: Наука, 1981. – 195 с.
14. Соловкин, А.А. Древнерусский топорик-оберег с городища «Царино» / А.А. Соловкин, С.М. Полтавец // Святогірський альманах. Зб. наук. праць. КЗ «Державний історико-архітектурний заповідник у м. Святогірську». – Донецьк, 2013. – С. 64 – 68.
15. Сементовский, А.М. Белорусские древности / А.М. Сементовский. – Вып. 1. – Спб., 1890. – 136 с.
16. Успенская, А.В., Нагрудные и поясные привески / А.В. Успенская // Очерки по истории русской деревни X – XIII вв. ТГИМ. – 1967. – Вып. 43. – С. 88 – 112.
17. Шмидт, Е.А. Кривичи смоленского Поднепровья и Подвинья (в свете археологических данных) / Е.А. Шмидт. – Смоленск, 2012. – 168 с.
18. Штыхов, Г.В. Города Полоцкой земли (9 – 13 в.) / Г.В. Штыхов. – Минск: Наука и техника, 1978. – 156, [3] с.
19. Nadolski, A. Miniaturowy toporck z grodziska w Timie pod Leczyca / A. Nadolski //Przeglad archeol. 1953. – T. IX. – № 2.
20. Paulsen, P. Axl und Kreuz in Nord und Osteuropa / P. Paulsen. – Bonn, 1956.

**УДК 903/904:657.371.1(476.1)**

## АРХЕАЛАГІЧНЫЯ ПОМНІКІ БАРЫСАЎСКАГА РАЁНА І ПРАБЛЕМЫ ІНВЕНТАРЫЗАЦЫІ

***канд. гіст. навук, дац. В.І. КОШМАН***
**Інстытут гісторыі НАН Беларусі, Мінск**

*Прысвечаны асноўным вынікам інвентарызацыі археалагічных помнікаў Барысаўскага раёна Мінскай вобласці. Коратка прадстаўляецца гісторыя даследавання археалагічнай спадчыны раёна, аналізуецца колькасць археалагічных помнікаў у разнастайных крыніцах, праблемы разнастайнага характара, з якімі сутыкаюцца даследчыкі пры правядзенні такіх работ.*

Археалагічная спадчына Барысаўскага раёна стала аб'ектам даследавання аматараў і навукоўцаў з канца XIX ст. Асобныя пахавальныя помнікі на тэрыторыі раёна даследаваліся Цітусам Саподзькай, Генрыхам Татурам. Перад І сусветнай вайной раскопкі курганоў у Барысаўскім павеце праводзіў Ю.В. Шчавельскі.

Першая спроба каталагізацыі археалагічных аб'ектаў на тэрыторыі Барысаўшчыны адносіцца да 1924 г., калі па паветах былі разасланы т.зв. "апытальныя лісты", якія і ўтрымлівалі пытанні звязанныя з месцазнаходжаннем якіх-небудзь адметных гістарычных або археалагічных помнікаў у рэгіёнах. "Апытальныя лісты" змяшчаюць інфармацыю аб шэрагу археалагічных аб'ектаў і на тэрыторыі сучаснага Барысаўскага раёна [7].

З утварэннем у 1920-я гг. пры Інбелкульце і далей БелАН археалагічнай секцыі, работа па вывучэнню археалагічных помнікаў Беларусі, у тым ліку і сучаснага Барысаўскага раёна, стала больш актыўнай і плённай. Былі ажыццяўлены палявыя разведкі з масавым выяўленнем і вывучэннем археалагічных помнікаў розных гістарычных эпох (разведкі І.Р. Калодкіна і М.М. Канвісарава [11, 12], А.М. Ляўданскага [4, 5]. Вынікі гэтых маштабных работ дагэтуль маюць вялізарнае значэнне.

У другой палове XX ст. археалагічнае вывучэнне Барысаўскага раёна працягвалася. Даследаванні былі ажыццяўлены на помніках каменнага веку У.П. Ксяндзовым (Глівін), жалезнага веку – А.Р. Мітрафанавым (Аздзяцічы, Дзядзілавічы, Кімія, Навасёлкі), помніках эпохі Старажытнай Русі –

Г.В. Штыхавым (Стара-Барысаў, Глівін). Палявыя разведкі з маніторынгам стану ўжо вядомых помнікаў, выяўленнем новых, а таксама шурфоўкай і невялікімі раскопкамі на помніках праводзіліся Л.Д. Побалем (Слабодка / + разведкі), Ю.А. Заяцам (Барысаў, Веляцічы / + разведкі), В.А. Карпекай (разведкі), Э.М. Зайкоўскі (Крынічкі-1), А.У. Ільюцік (Слабодка) і інш.

Вынікам работ сталі асобныя навуковыя артыкулы, якія ўводзяць у навуковы зварот матэрыялы раскопак [1; 4; 14 і г.д.], часткі манаграфічных і навукова-папулярных даследаванняў [2; 6, с. 94–95; 16, с. 100–102 і г.д.] і адпаведна навуковыя палявыя справаздачы даследчыкаў (захоўваюцца ў Архіве археалагічнай навуковай дакументацыі Інстытута гісторыі НАН Беларусі). У кантэксце заяўленай праблематыкі, нас цікавяць дадзеныя аб археалагічных помніках, наяўнасць якіх знайшло адлюстраванне на старонках літаратуры, якая традыцыйна інтэрпрэтуюцца даследчыкамі як “зводы помнікаў археалогіі”.

Так, згодна “Археалагічнай карце” 1971 г. Г.В. Штыхава [15, с. 163–168, № 51–108], на тэрыторыі Барысаўскага раёна фіксавалася 57 археалагічных аб’ектаў (25 гарадзішчаў, 38 курганных могільнікаў, 3 селішчы і 2 камня).

У зводзе археалагічных помнікаў, складзеных Л.Д. Побалем [9, с. 350–354, № 38–96] на тэрыторыі Барысаўскага раёна даследчык адзначае 58 археалагічных аб’ектаў, з якіх 41 гарадзішча.

“Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі” [3, с. 49–84] змяшчае інфармацыю і схематычныя планы на 55 археалагічных помніка, з якіх 15 гарадзішчаў, 34 курганных могільніка, 5 паселішчаў (селішчаў) і 1 камень.

“Список памятников ….” [13, с. 186–190, № 1173–1203] змяшчае інфармацыю аб 31 помніку археалогіі, з якіх 13 гарадзішчаў, 14 могільнікаў, 1 селішча і 3 камня.

Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь, які быў падрыхтаваны ў 2007 г. у адпаведнасці з артыкулам 24 Закона Рэспублікі Беларусь “Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь” змяшчае толькі 25 археалагічных помніка на тэрыторыі Барысаўскага раёна. Згодна пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь № 578 ад 14.05.2007 г. і пратакола пасяджэння Навукова-метадычнай рады № 79 ад 4.12.2002 г. усім помнікам археалогіі была нададзена 3 катэгорыя (“гісторыка-культурныя каштоўнасці, адметныя духоўныя, мастацкія і (або) дакументальныя вартасці якіх маюць значнасць для асобных рэгіёнаў Рэспублікі Беларусь”).

Перад пачаткам інвентарызацыі 2012 г. спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей (помнікі археалогіі) Барысаўскага раёна выглядаў наступным чынам:

1). Замчышча ў г. Барысаве, шыфр 613В000001;
2). Курганны могільнік у г. Барысаве, шыфр 613В000005;
3). Гарадзішча перыяду ранняга жалезнага веку, в.Аздзяцічы, шыфр 613В000008 / (знішчана);
4). Гарадзішча перыяду ранняга жалезнага веку, в. Барань, шыфр 613В000009;
5). Курганны могільнік, в.Востраў, шыфр 613В000012
6). Курганны могільнік, в. Гаравец, шыфр 613В000013;
7). Гарадзішча перыяду ранняга жалезнага веку, в. Дзедзілавічы, шыфр 613В000015;
8). Селішча перыяду ранняга жалезнага веку, в. Дзедзілавічы, шыфр 613В000016;
9). Ушаноўваемы камень перыяду бронзавага веку, в. Іканы, шыфр 613В000018;
10). Гарадзішча перыяду ранняга жалезнага веку, в.Кімія, шыфр 613В000021;
11). Гарадзішча перыяду ранняга жалезнага веку, в. Крацэвічы, шыфр 613В000022;
12). Каменны крыж перыяду позняга сярэднявечча, в. Крынічкі, шыфр 613В000023;
13). Курганны могільнік-1, курганны могільнік-2 в. Крынічкі, шыфр 613В000024;
14). Курганны могільнік, в. Крынічкі, шыфр 613В000025;
15). Гарадзішча перыяду ранняга жалезнага веку, в. Крынічкі, шыфр 613В000026;
16). Гарадзішча перыяду ранняга жалезнага веку, в. Лаўнікі, шыфр 613В000027;
17). Гарадзішча перыяду ранняга жалезнага веку, в. Ляшчыны, шыфр 613В000028;
18). Курганны могільнік, в. Малое Стахава, шыфр 613В000030;
19). Гарадзішча перыяду ранняга жалезнага веку, в. Навасёлкі, шыфр 613В000032;
20). Курганны могільнік, в. Ніўкі, шыфр 613В000033;
21). Гарадзішча перыяду сярэднявечча, в. Обча, шыфр 613В000034;
22). Курганны могільнік, в. Пчэльнік, шыфр 613В000035;
23). Гарадзішча перыяду ранняга жалезнага веку, в. Слабодка, шыфр 613В000036;
24). Гарадзішча старажытнага Барысава, в. Старабарысаў, шыфр 613В000037;
25). Каменны могільнік, в. Хаўхоліца, шыфр 613В000041

Як бачна, у параўнанні з раней вядомымі "спісамі", колькасць помнікаў археалогіі было скарочана амаль ў два разы. Нам дакладна невядома як асоба(ы), яка(і)я рыхтавала спіс гэтых помнікаў, так і крытэрыі, якімі кіраваліся пры адборы помнікаў.

На працягу вясны – восені 2012 г. згодна з дагаворам паміж Інстытутам гісторыі НАН Беларусі і аддзелам культуры Барысаўскага райвыканкама была праведзена інвентарызацыя помнікаў археалогіі. Падчас абследавання вызначаліся дакладнае размяшчэнне помніка на мясцовасці, яго памеры, сучасная захаванасць помніка, сляды пашкоджання пры супастаўленні з папярэднімі дадзенымі. У абследаванні прынялі ўдзел спецыяліст аддзела культуры па ахове помнікаў І.В. Сайчык і м.н.с. З.А. Харытановіч і аспірант С.Б. Ліневіч (на 1 этапе). Аўтарам артыкула былі складзены навуковыя пашпарты на гісторыка-культурныя каштоўнасці, вызначаны іх ахоўныя зоны, падрыхтаваны тлумачальная запіска і праект ахоўных зон для Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Праект зон аховы распрацоўваўся на падставе гісторыка-архіўных, бібліяграфічных і палявых археалагічных даследаванняў, з улікам сучаснага ландшафта раёна, сучаснага стану захавання помнікаў археалогіі і іх лакалізацыі, з мэтай забяспячэння аховы гісторыка-культурных каштоўнасцей і гістарычнага асяроддзя вакол іх. Неабходнасць вызначэння ахоўных зон заключалася і ва ўстанаўленні рэжымаў іх утрымання і выкарыстання. Было вызначана, што патрабуецца ўстанаўленне зон рэгулявання забудовы для тэрыторыі замчышча г. Барысава (шыфр 613В000001), гарадзішча Навасёлкі (шыфр 613В000032), гарадзішча старажытнага Барысава (шыфр 613В000037). Адзначана, што работа можа быць праведзена пры ўдзеле ўсіх зацікаўленых бакоў (уладальнікі сядзібаў, землекарыстальнай службы і аддзела культуры Барысаўскага райвыканкама, спецыялістаў-археолагаў Інстытута гісторыі НАН Беларусі). Устанаўленне зон рэгулявання забудовы для астатніх гісторыка-культурных каштоўнасцей – археалагічных помнікаў Барысаўскага раёна Мінскай вобласці не патрабавалася, у сувязі з тым, што яны размяшчаюцца за межамі населеных пунктаў ці на іх ускраінах, якія не трапляюць у межы будаўнічых работ.

Пад час інвентарызацыі помнікаў археалогіі Барысаўскага раёна выявілася шэраг праблем і недакладнасцей, якія зводзяцца да наступнага:

1. *Праблема вызначэння ахоўнай зоны з прычыны немагчымасці (складанасці) лакалізаваць межы помніка ў сучаснай забудове* (Напрыклад: замчышча ў Барысаве, гарадзішча Навасёлкі).

Так, замчышча ў Барысаве ўключана ў т.зв. Дзяржаўную праграму "Замкі Беларусі" на 2012–2018 гг." Праграмай прадугледжваецца распрацоўка праекта зон аховы і добраўпарадкаванне тэрыторыі. На перыяд 2013–2017 гг. мусіць быць выдаткавана да 90 млн.рублёў Адказнымі за работы прызначаны Мінскі аблвыканкам і Барысаўскі райвыканкам. Аднак азнаямленне з гэтым дакументам выклікае здзіўленне, так, чамусьці, храналагічныя межы існавання помніка вызначаны як XII–XIV стст., хаця вядомымі мне даследаваннямі гэтых напластаванняў пакуль не выяўлена. Увогуле, лакалізацыя былога Барысаўскага замка на мясцовасці як і вызначэнне яго ахоўнай зоны стала вельмі праблемным заданнем пры інвентарызацыі 2012 г.

Паспрабуем разабрацца. У беларускай гістарычнай навуцы лічыцца, што Барысаў дэманструе прыклад т.зв. "пераносу гарадоў". Першапачатковы Барысаў (узгадваецца ў 1102, 1127/28 гг.) размяшчаецца ў в. Старабарысаў, дзе ён праіснаваў прыкладна да XIII ст. Верагодна, што ў XIV ст. паселішча магло быцт перанесена на 3,5-4 км на паўднёвы-усход. На нізкім левым беразе р. Бярэзіны, на востраве, быў пабудаваны Барысаўскі замак, які неаднаразова ўзгадваецца ў пісьмовых дакументах ВКЛ і Рэчы Паспалітай. Звесткі аб Барысаўскім замку, які падпарадкоўваўся Свідрыгайле, маюцца ў нямецкім спісе замкаў 1430 г. Пад час войнаў з Маскоўскай дзяржавай і ўнутранніх канфліктаў у пачатку XVI ст. Барысаўскі замак вытрымаў некалькі аблогаў (1507, 1508, 1514, 1518, 1519, 1534, 1538 гг. і інш.). Аднак непасрэдна штурмам самога замка маскоўскія войскі не займаліся, бо, хутчэй, з самага пачатку свайго існавання замак быў дастаткова добра ўмацаваны. Ён быў абкружаны высокім земляным валам з драўлянымі сценамі і вежамі, а таксама ровам, які мог напаўняцца водамі Бярэзіны і Праллі. Цікавае апісанне Барысаўскага замка маецца ў Мацея Стрыйкоўскага пад час Лівонскай вайны (1858–1582 гг.). Барысаў ім апісваўся як драўляны горад з замкам, які ўмацаваны вежамі і парканам. Паміж парканам былі размешчаны камяні. Рэчка Бярэзіна акаляла замак у якім размяшчаўся гарнізон салдат. Італьянскі вайсковец А.Гваніні ў 1581 г. таксама пакінуў апісанне Барысаўскага замка ў сваёй працы "Sarmatiae Europeae descriptio" ("…*Барысаў – месца драўлянае. Замак зроблены з дуба і самым лепшым спосабам умацаваны баштамі (propugnaculls) і драўлянымі чатырохрадовымі сценамі, якія ўнутры запоўнены зямлёй і каменнем. Замак выгадна абкружаны навокал р. Бярэзінай*"). Невялікія апісанні Барысаўскага замка маюцца ў Трыфана Карабейнікава і Мікалая Варкочу, якія праязджалі праз горад у 1593 г. ("*городок Борисов древян, невелик, поменшы Дорогобужа, под ним река Березина, с реку с Одрев, да около*

*пруд, а от городка едучи к Менску, мост древяной, через реку, через пруд, в длину его сажен з 200*". Пад "городком", відаць, разумеўся замак). Згодна з планамі Багуслава Радзівіла ў 1647 г. замак уяўляў сабой умацаванне з 5 басцёнамі, якія былі абкружаны глыбокім рвом. З усходу да яго прымыкаў яшчэ адзін збудаваны новы замак. Новы замак меў лінію абароны ў выглядзе астрога, абнесенага валам і ровам. На яго пляцоўке знаходзіўся інкастэляваны храм, які меў патаемную сувязь праз лех з старым замкам. Паблізу ўмацаванняў знаходзіўся драўляны мост на палях цераз Бярэзіну. Шмат інфармацыі аб Барысаўскім замку маецца пад час ваеннай кампаніі 1654-1667 гг., калі горад быў знішчаны і адноўлены зноў. Умацаванні неаднаразова перабудоўваліся. Пад час работ на землянымі валу былі ўзведзены вежы і сцены з байніцамі, выкапаны калодзеж, зроблены тайнік да Бярэзіны, узведзены больш 145 жылых і гаспадарчых пабудоў. На тэрыторыі падзамка былі насыпаны басцёны, а лініі вала падзамка і замка злучаны паміж сабою. У апісаннях замка 1656, 1659, 1661 гг. захаваліся яго абмеры (312 сажэняў па сценах у дыўжыню, шырыня сцен 4 сажні, шырыня рова 7 сажняў, глыбіня рова 4 сажні). У замку налічвалася 21 гармата, 4 пішчалі віленскіх, 30 пішчалей медных палкавых, гармата малая палкавая, пішчаль медная драбавая віленская, вялік запас пораху (390 пудоў), ядраў і куляў. Восенню 1662 г. барон А. Маерберг, які праязджаў праз Барысаў, адзначаў, што *"... Барысаў складаецца з 2 крэпасцей на левым беразе Бярэзіны, воды якой, прымножаныя водам рэчкі Схі, цякуць і абкружаюць яго. Пабудоў у якім няма ніякіх, акрамя ўбогага жытла ваяводы з капліцаю..., а горад, што прылягае да крэпасцей, разбураны*». У 1697 г. Барысаўскія замкі пачалі прывадзіць ў парадак, аднак яшчэ ў 1698–1699 гг. Іаан Карб, які ехаў праз Барысаў, замкі у ім не адзначае. Земляныя бастыённыя ўмацаванні замкаў і рвы, напоўненыя вадою, захоўваліся ў добрым стане да канца XVIII ст. У 1776 г. кароль Станіслаў Аўгуст падараваў Барысаўскія замкі з землямі князю Міхаілу Радзівілу, які размясціў у іх адміністрацыю сваіх маенткаў і пачаў перабудову замкаў. Перабудаваны барысаўскім старастам Агінскім стары замак быў цалкам драўляны, але на высокім каменным фундаменце, выцягнуты ў даўжыню. Галоўнае месца ў яго забудове займаў палац, а службовыя памяшканні мелі рэгулярнае размяшчэнне. Праз адну драўляную браму быў зроблены ўваход. Ад замка на вуліцу Харугвеную, дзе на месцы новага замка стаяў абнесены ровам з вадою харугвенны дом, цягнуўся вузкі мост з адной парэнчай для пешаходаў. Калі ў пачатку XIX ст. адміністрацыя пакінула замак і перайшла ў новазбудаваныя памяшканні ў маентку Стара-Барысаў, ён некаторы час быў месцам выбараў дваранскіх сходаў. Аднак без гаспадара былы замак даволі хутка прышоў у заняпад і амаль увесь струхлеў. Пасля гэтага на месцы службовых памяшканняў было вырашана зрабіць казармы для інваліднай каманды, некаторую іх частку, размешчаную па-за межамі вострава, прадалі. Другую частку вострава займала драўляная турма. Разам з гэтай рэканструкцыяй будынкаў былі знішчаны земляныя ўмацаванні замкаў, якія на той час яшчэ існавалі ў добрым стане. У гэты ж час была засыпана частка абваднога рва і на ім утворана вуліца.

Напрыканцы 1857 г. быў складзены каштарыс на пабудову новых мураваных будынкаў турмы, але ў прамежку паміж 1861 і 1866 гг. турэмныя будынкі ў Барысаве ў тагачасных дакументах яшчэ не адзначаюцца.

Пасля будаўніцтва на месцы замчышча паўстаў двухпавярховы каменны будынак - «турэмны замак», які быў абнесены каменнай сцяной. Вакол турэмных будынкаў па-ранейшаму з аднаго боку было рэчышча Бярэзіны, з другога – былы абарончы роў.

Падчас савецка-польскай у 1920 г., калі лінія фронту працяглы час праходзіла па Бярэзіне, сцены і дах турмы былі моцна пашкоджаны абстрэламі з гармат з правага берага Бярэзіны. У 1923–1924 гг. будынкі былі адноўлены і выкарыстоўваліся па прызначэнню яшчэ некалькі дзесяцігодзяў. Пасля Вялікай Айчыннай вайны асноўная частка старых будынкаў была закінута і паступова стала разбурацца. Да нашага часу ад "турэмнага замка" засталася толькі частка будынка.

Зараз Барысаўскае замчышча размяшчаецца ў 0,5 км ад сучаснага рынку г. Барысава, на левым нізкім беразе р. Бярэзіна, у раёне вул. Гогаля (каардынаты даўг. 54º 14'24.47"; шыр. 28º 30'03.48). Згодна з апісаннямі А.М. Ляўданскага ў 1928 г. замчышча размяшчалася на нізкім авальным востраве, які быў акружаны старым рэчышчам з вадой. Памеры вострава складалі каля 300 х 200 м. Даследчык адзначыў, што для праходу на востраў зроблена 2 масты для праходу праз рэчышча, а сама пляцоўка моцна зруйнавана падчас будаўніцтва турмы і іншых будынкаў. Слядоў вала не прасочвалася. Па звестках Д.І. Даўгялы, у другой палове XIX ст. тэрыторыя замчышча была значна зменена пры пракладцы вуліцы і з паўночнага боку знікла воднае абмежаванне, у выніку чаго востраў ператварыўся ў паўвыспу.

У 1928 г. А.М.Ляўданскі ўпершыню даследаваў замчышча на востраве. Ім распрацавана 3 шурфы (два з паўночна-усходняга краю, адзін у цэнтры пляцоўкі). Культурны пласт 0,8-1,5 м не меў дакладнай стратыграфіі. У вугальным прапласту выяўлена некалькі фрагментаў ганчарнага посуду. У 1963 г. у час

земляных работ на вул. Гогаля на глыбіні 1 м выяўлены 10 каменных ядраў для гармат XIV-XV стст. У 1965 г. і 1968 г. шурфоўку на замчышчы праводзіў Г.В.Штыхаў. Выяўлена кераміка XIV-XVIII стст.

Мясцовыя краязнаўцы сведчаць, што роў старага замка захоўвался амаль нязменным да сярэдзіны 70-х гадоў XX ст., пасля чаго пачаў паступова засыпацца. Рэшткі паўднеавай і паўднева-заходняй частак абарончай воднай сістэмы былога замка, якая была ў пойме Бярэзіны, засыпана ў пачатку 90-х гадоў XX ст. Да нашага часу ад яе захавалася толькі невялікая частка з поўначы (вясной у гэтым месцы стаіць вада, а летам яно прымае выгляд забалочанай нізіны) і паўночнага ўсходу (тут пастаянна стаіць вада). Можна лічыць, што на сённяшні дзень шматлікія будаўнічыя і земляныя работы знішчылі ўсе прыкметы ўмацаванняў і зніверліравалі замкавую паверхню.

У 1995 г. раскопкі на тэрыторыі замчышча праводзіў Ю.А. Заяц. На месцы будучай прыбудовы да будынку № 23А па вул. Гогаля (ААТ "Гандальсервіс") было распрацавана 3 шурфы і раскоп агульнай плошчай каля 200 кв.м. Культурны слой склаў каля 1,70–2,48 м. Былі выяўлены драўляныя канструкцыі, якія былі інтэрпрэтаваны даследчыкам як магчымыя абарончыя збудаванні XV – першай паловы XVI стст. Атрыманыя археалагічныя матэрыялы (кераміка, кафля), якія датуюцца XVI–XVIII стст. Даследчыкам адзначаны шматлікія пашкоджанні культурнага слою, падсыпкі, складаныя і неспрыяльныя гідралагічныя ўмовы для вядзення раскопак.

Такім чынам, невялікія даследаванні 1960-х гг. (Г.В. Штыхаў) і 1990-х (Ю.А. Заяц) паказалі, культурны слой дасягае магутнасці 2,0 м, аднак ён моцна пашкоджаны розначасовымі землянымі і будаўнічымі работамі. Верхнія напластаванні (магутнасць 1,2–1,5 м) былі звязаны выключна з сучаснай падсыпкай глебай чорнага і шэрага колераў. Слой XV–XVIII стст. (шэры слой рознай кансістэнцыі магутнасцю 0,2–0,5 м) быў зафіксаваны толькі ў некаторых месцах раскопа, быў набліжаны да пахаванай старажытнай паверхні і мацерыка.

Ніводны з даследчыкаў XX ст. не здолеў акрэсліць дакладныя межы замчышча, распаўсюджванне яго культурнага слою, трасіроўку яго абарончых збудаванняў (валоў, рвоў). На дадзены момант рэшткі мяркуемага замчышча ўяўляюць невялікае ўзвышэнне вышынёй да 2,5 м у пойме левага берега р. Бярэзіны. Слядоў абарончых збудаванняў (вал, роў) не прасочваецца. Сучасная шчыльная забудова і карэнная змена тапаграфічнай сітуацыі (змена рэчышча, пракладка новых вуліц, нівеліроўка паверхні і г.д.) увогуле робіць праблематычным карэктнае вызначэнне як ахоўнай межы замчышча, так і вызначэнне яго межаў на мясцовасці. На наш погляд, гэтая работа магчыма толькі пасля маштабных археалагічных і геадэзічных работ на тэрыторыі былога замчышча, якія маглі бы праліць святло на сярэдневяковую тапаграфічную сітуацыю, устанавіць наяўнасць/адсутнасць культурных напластаванняў у розных частках узвышша. Для правядзення даследчых работ неабходна далучэнне спецыялістаў смежных спецыяльнасцей (архівістаў, гідрамарфолагаў, глебазнаўцаў, дэндрахранолагаў, спецыялістаў па магнітаразведцы, геарадарнаму сканаванню і інш.).

На наш погляд, для ўдзелу ў праграме "Замкі Беларусі" найлепшым чынам адпавядала бы старажытнае гарадзішча (дзядзінец) Барысава, якое размяшчаецца ў в. Старабарысаў. Менавіта гэты старажытны горад Полацкай зямлі ўзгадваецца ў летапісных паведамленнях 1102, 1127/28 гг. Гарадзішча і вакольны горад (селішча-пасад) Старабарысава археалагічна вывучался Г.В. Штыхавым ў 1968, 1969, 1971 гг. Атрыманыя матэрыялы выдатна характарызуюць матэрыяльную і духоўную культуры сярэдневяковага старажытнага насельніцтва рэгіёна.

На дадзены момант, гарадзішча і вакольны горад старажытнага Барысава захавала ўсе прыкметы ўмацаванага пункта, знаходзяцца ў дастаткова добрым стане і пры адпаведным добраўпарадкаванні і рэкламнай рабоце ў стане прывабіць мноства турыстычных груп. Але і тут не абыйшлося без хібаў. У спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей дагэтуль не ўключаны вакольны горад (селішча-пасад), які размяшчаецца на суседнім ўзвышшы, а яго раскопкі Г.В. Штыхавым далі нават больш прадстаўнічы матэрыял, чым на гарадзішчы. Намі быў абследаваны гэты археалагічны аб'ект і складзена ўся неабходная ўліковая дакументацыя.

А вось для археалагізацыі Барысаўскага замчышча на вул. Гогаля патрэбны маштабныя работы, якія, спадзяюся, магчыма будуць праведзены ў бліжэйшы час.

2. *Пашкоджанне існуючых гісторыка-культурных каштоўнасцей* (фіксаваліся фактычна на кожным помніку археалогіі (для курганных могільнікаў – несанкцыянаваныя раскопкі і скарбашукальніцкія ямы розных часоў), для гарадзішчаў – гаспадарчая дзейнасць, сляды ўзяцця пяску і г.д.).

3. *Знішчэнне помнікаў археалогіі* (гарадзішча Аздзяцічы).

Гарадзішча Аздзяцічы дастаткова трывала ўвайшло ў пералік археалагічных помнікаў, якія прыводзяць навукоўцы для характарыстыкі асаблівасцей культуры штрыхаванай керамікі ў басейне

р. Бярэзіны. Помнік знаходзіўся за 1 км на паўднёвы захад ад вёскі, за калгасным машынным дваром, на высокім правым карэнным беразе р. Бярэзіны. Размяшчаўся на мысу, які ўтвораны глыбокімі ярамі, якія спадалі ў нізкую, месцамі забалочаную пойму. Пляцоўка гарадзішча авальная, памерам 50 × 30 м, выцягнута з захаду на ўсход. З усходняга боку было ўмацавана валам вышынёй каля 0,7 м і ровам глыбінёй 0,4–0,5 м, з поўначы і поўдня абмежавана ярамі вышынёй 8–9 м (звесткі А.Р. Мітрафанава на 1958 г.). Адкрыў гарадзішча і правёў невялікія раскопкі ў 1930 г. А.М. Ляўданскі. Паўторна ім было абследавана ў 1931 г. Выяўлены фрагменты ляпной штрыхаванай керамікі, гліняныя праселкі, 3 наканечніка жалезных коп'яў, абломак жалезнага рыбалоўнага кручка, рэшткі горнаў ад выплаўкі жалеза. У 1958 г. А.Р.Мітрафанаў даследаваў 264 кв.м. Выяўлены рэшткі 2 жытлаў, заглыбленных на 0,15–0,3 м у зямлю. Плошча аднаго жытла 17 кв.м., другога – 26 кв.м. Знойдзены рэшткі ляпнога глінянага посуду, гліняныя праслiцы, наканечнік кап'я, абломак нажа. Гарадзішча датуецца раннім жалезным векам (1 ст. да н.э. – 1 ст. н.э.) і належыла насельніцтву культуры штрыхаванай керамікі.

Пры абследаванні помнікаў басейна р. Бярэзіны ў 1988 г. Л.Д. Побалем быў зафіксаваны факт знішчэння гарадзішча мясцовым калгасам. Даследчык адзначыў, што ім былі прадпрыняты меры для пакарання вінаватых.

У час інвентарызацыі 2004 г. было падцверджана, што помнік быў разбураны ў пачатку 80-х гадоў XX ст. З боку поля захавалася толькі невялічкая частка вала з ровам. Сама гара поўнасцю знішчана. Пясок бралі для будаўніцтва дарогі не гледзячы на тое, што на помніку археалогіі стаяў ахоўны знак. Кар'ер на той час ужо зарос лесам. Пры абследаванні 2012 г. факт знішчэння гарадзішча цалкам падцвердзіўся.

Рашэннем Навукова-метадычнай рады Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ад 26 сакавіка 2014 г. (выпіска № 11-01-01/212) гарадзішча Аздзяцічы было рэкамендавана выключыць з спісу гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь.

4. *Недакладная інтэрпрэтацыя помніка* (Напрыклад: Обча, Хаўхоліца, Іканы).

Выяўлены таксама неадпаведнасці ў атрыбуцыі археалагічныых аб'ектаў і пэўная блытаніна пры ўключэнні ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь.

Так, пад № 613В000034 у Спісе лічыцца "Гарадзішча перыяду сярэднявечча IX – XVI стст." у в. Обча (0,4 км на паўднёвы захад ад вёскі, каля дарогі на в.Барань). Між тым, пад назвай "гарадзішча" сюды памылкова ўключаны курганны могільнік, які сапраўды размяшчаецца каля в. Обча ў 0,4 км на паўднёвы захад ад вёскі, справа ад дарогі на в. Барань (Загоцец), злева ад дарогі ў в. Обча, у 250-300 м на паўднёвы-захад ад вясковых могілак, каля ліні ЛЭП. Пры абследаванні 2012 г. налічана каля 100 курганоў. Могільнік выцягнуты ў напрамку поўнач-поўдзень і тапаграфічна займае узвышаны схол пагорка. Даўжыня курганнага могільніка каля 350 м, шырыня 300–350 м. Курганы раскіданы па лесу і можна гаварыць, як мінімум, аб 2 курганных групах. У могільніку, сярод "малых" курганоў (вышыня 0,5–0,6 м. дыяметр 3–4 м) і "сярэдніх" курганоў (вышыня 1,0–1,6 м, дыяметр 5–6 м) сустракаюцца і вельмі высокія насыпы (3,5–4,0 м, дыяметр да 15 м). На большасці курганоў маюцца пашкоджанні ў выглядзе скарбашукальніцкіх ямаў зверху і з бакоў. Для вялікіх насыпаў уласцівы кальцавыя ровікі (у тым ліку з перамычкамі) глыбінёй да 1,0 м і шырынёй да 1, 7 м. Ровікі прысутнічаюць і ў "сярэдніх" па памерах курганоў. Гэты могільнік вядомы з т.зв. "Апытальных лістоў" 1924 г., абследаваўся ў 1979 г. В.А. Карпекам. Інфармацыя аб гэтым курганным могільніку змяшчаецца ў шэрагу работ [3, с. 79, № 182; 15, с. 163, № 51; 10, с. 320, № 803; 9, с. 350, № 41].

Адзначым, што магчымая памылка ў атрыбуцыі гэтага помніка з'явілася ў 1990 г., калі быў выдадзены т.зв. "Список памятников истории и культуры республиканского значения Белорусской ССР. Книга 2. Памятники археологии". – Мн., 1990 [13, с. 188, № 1189]. Менавіта там маецца ўказанне, што каля в. Обча пад № 1189 змяшчаецца "Городище. Ранний феодализм. 9-16 вв.", аднак дастаткова правільна ўказваецца, што тут размяшчаееца "50 полусферических курганов высотой 0,5–3 м и диаметром 6–18 м ".

Такім чынам, "гарадзішча" у ваколіцах в. Обча ніколі не існавала, інфармацыя аб такім археалагічным аб'екце не ўтрымліваецца ні ў адной археалагічнай крыніцы. Відавочна, што тут маецца памылка складальнікаў "Списка памятников …" у 1990 г., якая ў далейшым перайшла ў іншыя дакументы і спісы.

Пад шыфрам 613В000041 у в. Хаўхоліца лічыцца "каменны могільнік XIII–XIV стст." у 1,3 км на ўсход ад вёскі, за мостам цераз р.Нача, на правым беразе ракі. Сапраўды, на гэтым месцы размяшчаецца курганны могільнік. Аднак справа ў тым, што ў ваколіцах в. Хаўхоліца раней размяшчалася два могільніка. Першы з іх – каменны, які вядомы з 1930-х гг. Археалагічны помнік налічваў на той час

45 круглых курганоў і каменныя магілы. У 1931 г. А.М. Ляўданскі ў 1,5 км на поўнач ад вёскі, на ўзгорку, даследаваў 2 курганы і каменную магілу. У курганах былі знойдзены касцякі ў магільных ямах арыентаваныя галавой на захад. Інвентар адсутнічаў. У каменнай магіле выяўлена пахаванне па абраду інгумацыі, арыентаванае галавой на захад. Выяўлены шыферны крыжык, промні якога былі арнаментаваныя ажурнымі накладкамі. Даследчык аднёс курганы да XI–XII стст., а каменныя магілы да XIII–XIV стст. Між тым, яшчэ пры абследаванні археалагічных помнікаў Барысаўскага раёна ў 1979 г. (Ш.В. Штыхаў, В.А. Карпека, Ю.А. Заяц) было адзначана, што гэты помнік (каменны могільнік) на той час ужо не існаваў і быў знішчаны кар'ерам.

На дзяржаўны ўлік у 1990 і 2007 гг. быў пастаўлены іншы курганны могільнік, але пад назвай "каменны могільнік". Гэты помнік археалогіі часткова захаваўся па сённяшні дзень за 1,3 км на ўсход ад вёскі, за мастом цераз р. Нача, на яе правым беразе, абапал дарогі ў в. Востраў. Раней тут налічалася каля 25 курганоў. Пры абследаванні 1979 г. (В.А.Карпека) улічана 12 насыпаў. Пры інвентарызацыі 2004 г. налічана 20 насыпаў. У 2012 г. пры ўважлівым аглядзе мясцовасці зафіксавана 16 курганоў рознай ступені захаванасці. На самым высокім кургане пастаўлена мемарыяльная дошка, на якой напісана, што ў 1942 г. была спалена в. Задні Мост і растраляны 5 яе жыхароў. Раскопкі не праводзіліся, аднак пры абследаванні 1979 г. адзначана, што ў пашкоджаных дарогай курганах знойдзены чалавечыя косткі і ганчарны гаршчок XI ст. з патоўшчаным краем.

Як бачым, у гэтым выпадку назіраецца блытаніна, калі назва знішчанага каменнага могільніка, які даследаваўся ў 1931 г. і размяшчаўся ў іншым месцы, была перанесена на існуючы курганны могільнік.

Пры інвентарызацыі 2012 г. такія факты блытаніны ўлічваліся і выпраўляліся. Адпаведна пашпарты на гісторыка-культурныя каштоўнасці Барысаўскага раёна складаліся з улікам актуальнай інфармацыі.

У распрацаванай дакументацыі 2012 г. было ўведзена раздзяленне курганных могільнікаў каля в. Крынічкі. Справа ў тым, што па незразумелай прычыне ў "Спісе…" пад рознымі шыфрамі фігуруе адзін і той жа курганны могільнік. Так, існуе курганны могільнік Крынічкі – 1 (шыфр 613В000024), які размешчаны ў 1,2 км на паўночны-усход ад вёскі, у 40–60 м на паўднёвы-усход ад гарадзішча (абапал дарогі на гарадзішча), у лесе, ва ўрочышчы Ключы. Аднак тут жа пералічваецца і другі курганны могільнік (Крынічкі – 2), які занатаваны пад тым жа шыфрам уліку. У той жа час гэты ж курганны могільнік ўзнікае ніжэй пад той жа лакалізацыяй (шыфр 613В000025). Гэта абсалютна іншы курганны могільнік (Крынічкі – 2), які размяшчаецца ў 2–2,2 км на паўднёвы-усход ад вёскі, злева ад лясной дарогі ў в. Зачысце.

Не зусім зразумела было вызначэнне помніка пад шыфрам 613В000018 як "ушаноўваемы камень перыяду бронзавага веку" каля в. Іканы. Справа ў тым, што ўвогуле не праводзіліся археалагічныя даследаванні каля валуна, якія маглі бы прадставіць матэрыялы, якія бы датавалі гэты валун як аб'ект пакланення якога-небудзь часу. Гэты валун вядомы з канца XIX ст. і неаднаразова даследаваліся геолагамі (В.Ф. Вінакураў, Э.А. Ляўкоў), а ў 1985 г. аглядаўся археолагам Л.У. Дучыц. З камнямі "быкамі" звязаны шматлікія легенды і паданні ("На першы дзень Вялікдня паехаў чалавек араць. Жонка прынесла яму абедаць, пайшла і сказала "Памагай Бог". І адразу ж чалавек, быкі, жанчына і сабака акамянелі"). Мясцовая назва валуноў – "быкі каменныя". Гэта камяні (сярэднезярністы чырвона-карычневага граніт), якія былі прынесены сюды пад час ледавіковага перыяду з Цэнтральна-Балтыйскага шчыта і Кольскай зоны гранулітавай фацыі. Фізічныя памеры камянёў (даўжыня 3,0 м, шырыня 1,8 м, вышыня над паверхняй зямлі 1,3 м; даўжыня 2,4 м, шырыня 1,4 м, вышыня над паверхняй зямлі 1,3 м). Камяні "Быкі" размешчаны ў 4 км на поўнач ад вёскі Іканы, у 50 м на захад ад шашы Р-3 Барысаў–Бегомль (км 53), урочышча Быкі (Лужа). Іканскае лясніцтва, квартал 35, выдзел 17. На паверхні расколатага камяня абітае 21 від лішайнікаў (4 рэдкіх: Rhizocarpon grande, Aspicilia cinerea, Cladonia glauca, Parmelia conspersa) і 8 відаў мха (рэдкі: Paraleucobryum longifolium). Камяням прыдадзены статус геалагічнага помніка. Па выніках абследавання намі было прапанавана называць гэтыя валуны як "ушаноўваемы камень "Быкі".

5. *Недакладнасць прывязак помнікаў на мясцовасці.*

Часцей за ўсё заключалася ў некарэктным вызначэнні адлегласці ад арыентыра да археалагічнага помніка і фіксавалася амаль на кожным з абследаваных помнікаў. Пры складанні ўліковай дакументацыі намі дадаваліся яшчэ і GPS-каардынаты, што ў будучым даўволіць больш аператыўна лакалізаваць помнікі на мясцовасці.

6. *Неабходнасць пашырэнне Дзяржаўнага спісу гісторыка-культурных каштоўнасцей.*

Вышэй намі адзначалася, што колькасць вядомых археалагічных аб'ектаў на тэрыторыі Барысаўскага раёна нашмат больш, чым прыняты Дзяржаўны спіс помнікаў.

Па магчымасці, намі былі таксама абследаваны шэраг іншых археалагічных аб’ектаў, якія раней фігуравалі ў спецыялізаванай літаратуры і падвяргаліся археалагічным раскопкам, аднак па незразумелай прычыне не былі ўключаны ў “Спіс…” (курганныя могільнікі Аздзяцічы 1–2, курганны могільнік Веляцічы, “Князь-камень” каля в. Бярозаўшчына, селішча-пасад у Старабарысаве). На гэтыя археалагічныя аб’екты таксама складзена адпаведная дакументацыя і ў бліжэйшы час яны будуць прапанаваны для ўключэння ў спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь.

7. *Праблемы адміністрацыйнай працэдуры зацвярджэння ахоўных зон археалагічных помнікаў і ўнясення дакладных звестак, якія атрыманы падчас інвентарызацыі 2012 г.*

6 мая 2014 г. Пастановай № 21 Міністэрства культуры былі зацверджаны праекты аховы гісторыка-культурных каштоўнасцей – помнікаў археалогіі Барысаўскага раёна Мінскай вобласці. Аднак аказалася, што прыкладзеныя праекты зон аховы карэнным чынам адрозніваюцца ад дакументацыі, якая была распрацавана пад час інвентарызацыі.

Так, замест 25 праектаў зон аховы помнікаў археалогіі Барысаўскага раёна у Пастанову № 21 трапілі толькі 20 помнікаў. Калі рэкамендаванае да выключэння гарадзішча Аздзяцічы (шыфр 613В000008) было пазбаўлена статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці нерухомага матэрыяльнага аб’екта (пасяджэнне Навукова-метадычнай рады Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, 26 сакавіка 2014 г., п. 5), то колькасць гісторыка-культурных каштоўнасцей – помнікаў археалогіі павінна налічваць 24 помніка. Фактычна “зніклі” наступныя помнікі археалогіі:

1. Замчышча ў г. Барысаве, шыфр 613В000001;
2. Курганны могільнік у г. Барысаве, шыфр 613В000005
3. Гарадзішча перыяду ранняга жалезнага веку, в. Навасёлкі, шыфр 613В000032

Аднак, нават сярод 20 зацверджаных праектаў зон аховы зноў былі паўтораны памылкі, якія былі выпраўлены пад час інвентарызацыі 2012 г. і прадстаўлены Міністэрству культуры Рэспублікі Беларусь ў тлумачальнай запісцы, навуковых пашпартах, праектах зоны аховы і зонах аховы. Прадстаўленая ў тэксце Пастановы № 21 інфармацыя аб археалагічных помніках супярэчыць рашэнню Навукова-метадычнай рады Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ад 26 сакавіка 2014 г. (выпіска № 11-01-01/212).

п. 6. Аб унясенні змяненняў у назву і месцазнаходжанне матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці

З мэтай удакладнення месцазнаходжання, назваў, датыровак і складу гісторыка-культурных каштоўнасцей і на падставе прадстаўленых матэрыялаў даследаванняў археалагічных помнікаў пагадзіцца з неабходнасцю ўнесення прапановы ў Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

1.1. у падраздзеле “Барысаўскі раён”:
пазіцыі

| | | | |
|---|---|---|---|
| “Каменны могільнік | XIII – XIV стагоддзі | в.Хаўхоліца, 1,3 км на ўсход ад вёскі, за мостам цераз р.Нача, на правым беразе ракі | 3” |

пазіцыяй:

| | | | |
|---|---|---|---|
| “Курганны могільнік | XI – XIII стагоддзі | в.Хаўхоліца, 1,3 км на ўсход ад вёскі, за мостам цераз р.Нача, на правым беразе ракі | 3”; |

пазіцыі

| | | | |
|---|---|---|---|
| “Ушаноўваемы камень перыяду бронзавага веку | – | в.Іканы, 4 км на поўнач ад вёскі, урочышча Быкі | 3” |

пазіцыяй:

| | | | |
|---|---|---|---|
| “Ушаноўваемы камень “Быкі” | – | в.Іканы, 4 км на поўнач ад вёскі, у 50 м на захад ад шашы Барысаў-Бегомль, ва ўрочышчы Быкі | 3”; |

пазіцыі

| | | | |
|---|---|---|---|
| “Гарадзішча перыяду сярэднявечча | IX – XVI стагоддзі | в.Обча, 0,4 км на паўднёвы захад ад вёскі, каля дарогі на в.Барань | 3” |

пазіцыяй:

| | | | |
|---|---|---|---|
| “Курганны могільнік | X – XIII стагоддзі | в.Обча, 0,4 км на паўднёвы захад ад вёскі, справа ад дарогі на в.Барань, у 250-300 м на паўднёвы-захад ад вясковых могілак | 3”; |

Library of Polotsk.su

Аказалася, што ў Пастанове № 21 зноў фігуруюць "ушаноўваемы камень перыяду бронзавагу веку каля в. Іканы" (шыфр 613В000018), "каменны могільнік" (XIII–XIV стст.) каля в. Хаўхоліца (шыфр 613В000041), не ўведзена раздзяленне курганных могільнікаў каля в. Крынічкі.

Такім чынам, інвентарызацыя археалагічных помнікаў Барысаўскага раёна, якія ўключаны ў спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь сутыкнулася не толькі з праблемамі практычнага пошуку, лакалізацыі, маніторынгу, карэктнай інтэрпрэтацыі і складання сучаснай уліковай дакументацыі, але і з несумленнымі адносінамі чыноўнікаў у сферы культуры. Пасля прыняцця 6 мая 2014 г. Пастановы № 21 Міністэрства культуры колькасць археалагічных помнікаў нават зменшылася, а ранейшыя памылкі перайшлі ў новы афіцыйны дакумент.

ЛІТАРАТУРА

1. Даўгяла, З.І. Барысаўскі замак (экскурс ў гісторыю яго ўзнікненьня і ўмацаванняў) / З.І. Даўгяла // Працы археолёгічнай камісіі. – Т. II. Запіску аддзелу гуманітарных навук. – Вып. 11. – Мінск, 1930. – С. 263–268.
2. Дзевяць стагоддзяў Барысава / Г.В. Штыхаў [і інш.]. – Мінск : Белта, 2002.
3. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Мінская вобласць. – Кн. 1. – Мінск : БелСЭ, 1987.
4. Ляўданскі, А.М. Археолёгічныя досьледы ў Барысаве / А.М. Ляўданскі // Запіскі аддзелу гуманітарных навук Беларускай Акадэміі навук. – Кн. 11. Працы археолёгічнай камісіі. – Т. II. – Мінск, 1930. – С. 253–261.
5. Ляўданскі, А.М. Кароткае паведамленне аб доследах культур эпохі жалеза ў БССР у 1930–1931 гг. / А.М. Ляўданскі // Працы секцыі археолёгіі. – Т. III. – Мінск, 1932. – С. 230–235.
6. Митрофанов, А.Г. Железный век средней Белоруссии (VII-VI вв. до н.э. – VIII н.э.) / А.Г. Митрофанов. – Мінск, 1978. – С. 94–95
7. Опросные листы 1924 г. по Минскому и Борисовскому уездам / Архіў археалагічнай навуковай дакументацыі ІГ НАН Беларусі. – Воп. 1. – Спр. 71.
8. Памяць: гіст.-дакум. хроніка Барысава і Барысаўскага раёна / Беларус. энцыкл. / Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1997. – 800 с.
9. Поболь, Л.Д. Археологические памятники Белоруссии. Железный век / Л.Д. Поболь. – Мінск : Наука и техника, 1983.
10. Поболь, Л.Д. Славянские древности Белоруссии (свод археологических памятников раннего этапа зарубинецкой культуры – с середины III в. до н.э. по начало II в. н.э.) / Л.Д. Поболь. – Мінск, 1974.
11. Рынейскі, А. Да археолёгічнага вывучэння Беларусі / А. Рынейскі // Наш Край. Штомесячнік Цэнтральнага Бюро Краязнаўства пры Інстытуце Беларускае Культуры. – 1929. – № 11. – С. 73–74.
12. Рынейскі, А. Разведачная археолёгічная экспедыцыя / А. Рынейскі // Наш край. Штомесячнік Цэнтральнага Бюро Краязнаўства пры Інстытуце Беларускае Культуры. – 1929. – № 8–9. – С. 87.
13. Список памятников истории и культуры республиканского значения Белорусской ССР. – Кн. 2 : Памятники археологии. – Мінск, 1990
14. Штыхаў, Г.В. "Паставіў град Барысаў у сваё імя …" / Г.В. Штыхаў // Беларускі гістарычны часопіс. – 2002. – № 4. – С. 15–21.
15. Штыхаў, Г.В. Археологическая карта Белоруссии / Г.В. Штыхаў. – Вып. 2: Памятники железного века и эпохи феодализма. – Мінск, 1971.
16. Штыхов, Г.В. Города Полоцкой земли (IX–XIII вв.) / Г.В. Штыхов. – Мінск, 1978. – С. 100–102.

**УДК 902/904**

## ШКЛЯНЫЯ ВЫРАБЫ XVI – XIX СТАГОДДЗЯЎ З МАТЭРЫЯЛАЎ АРХЕАЛАГІЧНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ ВІЦЕБСКІХ СЛАБОД

***П.С. КУРЛОВІЧ-БЯЛЯЎСКАЯ***
**Інстытут гісторыі НАН Беларусі, Мінск**

*Прысвечаны шкляным вырабам па матэрыялах археалагічных даследаванняў перыферыйных тэрыторый Віцебска (Заручаўе, Задзвінне і Задунаўе). Схема класіфікацыі шклянога посуду паводле прызначэння вылучае такія катэгорыі, як сасуды (розныя віды сталовых, тэхнічных і дэкаратыўных сасудаў) і інтэр'ернае шкло. Большасць артэфактаў выкарыстоўваліся ў другой палове XVIII – XIX стст. Шкляныя вырабы з Заручаўя і Задзвіння з'яўляюцца больш каштоўнымі, чым з Задунаўя*

Віцебск з'яўляецца адным з найбольш даследаваных гарадоў на тэрыторыі Беларусі. Першыя археалагічныя раскопкі тут правёў яшчэ А.П. Сапуноў на Замкавай Гары ў 1895 – 1896 гг. У 1928 г.